зіма — *зімовая* (*ж. р.*) *раніца*;
бяроза — *бярозавая* (*ж. р.*) *кара*.

**3** У сукенцы (якой?) *новай* (*адз. л., ж. р., М. с.*);
зямля (якая?) *чорная* (*адз. л., ж. р., Н. с.*);
вясну (якую?) *раннюю* (*адз. л., ж. р., В. с.*);



Спампавана з сайта www.aversev.by

на паперы (якой?) *каляровай* (*адз. л., ж. р., М. с.*);
з кнігай (якой?) *цікавай* (*адз. л., ж. р., Т. с.*);
пра вёску (якую?) *маленькую* (*адз. л., ж. р., В. с.*).

**4** Восень (*якая?*) *халодная* (*адз. л., ж. р., Н. с.*);
пралескай (*якой?*) *маленькай* (*адз. л., ж. р., Т. с.*);
з дарогі (*якой?*) *шырокай* (*адз. л., ж. р., Р. с.*);
шапку (*якую?*) *зімовую* (*адз. л., ж. р., В. с.*);
на зорку (*якую?*) *яркую* (*адз. л., ж. р., В. с.*);
дзяўчынцы (*якой?*) *прыгожай* (*адз. л., ж. р., Д. с.*);
аб рыбцы (*якой?*) *рачной* (*адз. л., ж. р., М. с.*).

**5** *Р. с.* — глыбокай паўнаводнай ракі; *Д. с.* — глыбокай паўнаводнай рацэ; *Т. с.* — глыбокай паўнаводнай ракой; *М. с.* — аб глыбокай паўнаводнай рацэ.

*Р. с.* — зімняй снежнай дарогі; *Д. с.* — зімняй снежнай дарозе; *Т. с.* — зімняй снежнай дарогай; *М. с.* — аб зімняй снежнай дарозе.

*Р. с.* — добрай вясёлай песні; *Д. с.* — добрай вясёлай песні; *Т. с.* — добрай вясёлай песняй; *М. с.* — у добрай вясёлай песні.

## Правер сябе

**1** *Ззяць.*

На небе *ззялі* яркія зоркі. У хлопчыка ад радасці *ззялі* вочы. Ад сонечных прамянёў *ззяла* кропелька расы. Посуд *ззяў* чысцінёй.



*Спампавана з сайта www.aversev.by*

**2** Добр*ая*, горк*ая*, салодк*і*, добр*ая*, добр*ую*, ранн*яя*, позн*яя*, смачнейш*ай*, родн*ай*, родн*ая*, чуж*ая*, чуж*ой*, добр*ай*, добр*ая*.

**3** Чырвон*ую* зару; у зімов*ую* сцюжу; у позн*юю* восень; пра родн*ую* краіну.

**4** Прыйшла *ранн**яя*** (*ж. р.*, *Н. с.*) вясна. Хутка вырасла *густ**ая*** (*ж. р.*, *Н. с.*) трава. Зацвілі *вяснов**ыя*** (*ж. р.*, *Н. с.*) кветкі. Дзеці гулялі на *шырок**ай*** *прыгож**ай*** (*ж. р.*, *М. с.*) паляне. Над травой лётала *лёгк**ая*** (*ж. р.*, *Н. с.*) страказа. На ўскрайку паляны расла *вялік**ая*** (*ж. р.*, *Н. с.*) бяроза. На бярозе звіла гняздо *шэр**ая*** (*ж. р.*, *Н. с.*) варона. Яна гучна каркала, можа, таксама радавалася *цёпл**ай*** (*ж. р.*, *Д. с.*) вясне.

**5** Я люблю гуляць па *бліжнім* лесе. Аднойчы восенню адбыўся *цікавы* выпадак. Вечарам я выйшла на *кароткую* прагулку. Раптам *вузкую* сцежачку перабегла вавёрка. Яна ўзабралася на *высокую* сасну і з *вялікай* цікаўнасцю пазірала на мяне. У зубках *рыжая* вавёрка трымала *маленькі* арэшак. Я стала размаўляць з *цікаўнай* вавёркай. Спачатку яна зацікаўлена слухала. Але ж неўзабаве я выпадкова махнула *невялікай* галінкай, якую трымала ў руках. *Рыжанькая* вавёрачка спуджана ўзмахнула *пухнатым* хвастом і скокнула на *іншую* сасну. Арэшак зваліўся на *сырую* зямлю. Можа, вясною прарасце.



*Спампавана з сайта www.aversev.by*

## Скланенне прыметнікаў множнага ліку

**2** Дубамі (*якімі?*) *магутнымі* (*мн. л., Т. с.*);
нотам (*якім?*) *знаёмым* (*мн. л., Д. с.*);
птушак (*якіх?*) *пералётных* (*мн. л., Р. с.*);
на лыжах (*якіх?*) *новых* (*мн. л., М. с.*);
пад рабінамі (*якімі?*) *чырвонымі* (*мн. л., Т. с.*);
пры бацьках (*якіх?*) *родных* (*мн. л., М. с.*).

**3** Прыгож*ыя* модн*ыя* акуляры.
Чырвон*ыя* садов*ыя* кветкі.
Вялік*ія* востр*ыя* нажніцы.
Нов*ыя* каляров*ыя* алоўкі.
Рознакаляров*ай* ярк*ай* вясёлкай.

**4** Рыжыя смешныя шчаняты — *Р. с. — рыжых смешных шчанят; В. с. — рыжых смешных шчанят; М. с. — аб рыжых смешных шчанятах.*

Любімыя малодшыя сястрычкі — *Р. с. — любімых малодшых сястрычак; В. с. — любімых малодшых сястрычак; М. с. — аб любімых малодшых сястрычках.*

Бліскучыя маленькія рыбкі — *Р. с. — бліскучых маленькіх рыбак; В. с. — бліскучых маленькіх рыбак; М. с. — аб бліскучых маленькіх рыбках.*

**5** Аб дзяўчынках добрых, прыветных — *М. с.*;
пры мараках падцягнутых, ваенных — *М. с.*;
у камп’ютарах сучасных, новых — *М. с.*;
на коўдрах снежных, белых — *М. с.*



*Спампавана з сайта www.aversev.by*

# Правер сябе

**1** *Вуліца*, *цвісці*.

**2** Гэты выпадак а*д*быўся ў адным з *гарадскіх* двароў. На *канадскім* клёне, што расце паміж *высокімі* будынкамі, сям’я сарок змайстравала гняздо. *Заакіянскія* клёны тут добра ўж*ы*ваюцца з нашымі. Па́ра *белабокіх* птушак з *доўгімі вузкімі* хвастамі некалькі *дз*ён запар насіла ў дзюбах *танюсенькія* галінкі і стара*нн*а ўладко*ў*вала ў гняздо на дрэве, куды потым былі адкла*дз*ены два *маленькія* яйкі.

І тут з’явіліся дзве *шэра-чорныя* вароны, якія вырашылі адабраць яйкі і гняздо ў гаспадаро*ў*. Пачалася бойка. *Вялізныя* вароны кіп*ц*юрамі рвалі ў сарок пер’е, якое *лёгкімі* парашу*ц*ікамі падала на *зялёны* дыван травы, аздоблены *залацістымі* дзьмуха*ў*цамі. *Моцнымі* дзюбамі *хітрыя*, *нахабныя* вароны наносілі *балючыя* ўдары.

Але ўсё ж такі с*а*рокі перамаглі і а*д*білі ў ворага*ў* сваё гняздо!

**3** У цёмн*ым* брудн*ым* пакоі — *у светлым чыстым пакоі* (*М. с.*).

Гарач*ае* летн*яе* надвор’е — *марознае зімовае надвор’е* (*Н. с.* / *В. с.*).

Нестаранн*ыя*, лянів*ыя* вучні — *старанныя, працалюбівыя* (*працавітыя*) *вучні* (*Н. с.*).



*Спампавана з сайта www.aversev.by*

Халодн*ым* зімов*ым* паветрам — *цёплым летнім паветрам* (*Т. с.*).

Брыдк*імі* пажоўкл*ымі* кветкамі — *прыгожымі свежымі кветкамі* (*Т. с.*).

Доўг*ай* зімов*ай* ноччу — *кароткай летняй ноччу* (*Т. с.*).

Вялік*ае* чорн*ае* кацяня — *маленькае белае кацяня* (*Н. с.* / *В. с.*).

Рознакаляров*ай*, ярк*ай* вясёлкай — *аднатоннай, цьмянай вясёлкай* (*Т. с.*).

4 1б, 2в, 3в, 4б, 5а, 6б, 7в, 8а.



Спампавана з сайта www.aversev.by

## *Ажыві малюнак*






*Спампавана з сайта www.aversev.by*

# Займеннік

**2** Прайшлі паміж імі, намі, вамі;
стаяла супраць мяне, яе, яго;
ішлі насустрач нам, вам, ім;
вісела над ёю, табою, ім;
лятала вакол нас, вас, іх.

**3** Пагаворым з *ёю* (*3-я ас.*, *Т. с.*);
намалявалі на *ім* (*3-я ас.*, *М. с.*);
пагулялі з *імі* (*3-я ас.*, *Т. с.*);
глядзелі пра *яго* (*3-я ас.*, *В. с.*);
падрыхтавалі для *іх* (*3-я ас.*, *Р. с.*);
пранеслі праз *яе* (*3-я ас.*, *В. с.*).

**4** Пайшоў да *яго* (*Р. с.*), быў у *яго* (*Р. с.*), бачыўся з *ім* (*Т. с.*), успамінаю аб *ім* (*М. с.*).

Размаўляла з *ёю* (*Т. с.*), хадзіла да *яе* (*Р. с.*), была ў *яе* (*Р. с.*), гаварыла пра *яе* (*В. с.*).

*3-я ас., Т. с.*
**5** Паляўнічы пайшоў у лес. За *ім* бег сабака. Вось
*3-я ас., Н. с.* *3-я ас., Д. с.*
прыйшлі *яны* ў лес. Раптам *ім* насустрач выскачыў за-
*3-я ас., Т. с.* *3-я ас., Р. с.*
яц. Сабака кінуўся за *ім*. Але ж заяц уцёк ад *яго*. Па-
*3-я ас., М. с.*
ляўнічы выйшаў на паляну. На *ёй* было маленькае азяр-
цо. Там сяліліся дзікія качкі. Паляўнічы асцярожна
*3-я ас., Р. с.*
падкраўся да *іх*, але тыя адчулі небяспеку і паляцелі.
Не ўдалося паляванне!



*Спампавана з сайта www.aversev.by*

## Правер сябе

**1** *Дэлегацыя*, чацвёрты, *услых*.

Мы вучымся ў *чацвёртым* класе. На ўроках фізкультуры я стаю *чацвёртым* па росце. Я адказаў на пытанне *ўслых*. Дачка чытала маме кніжку *ўслых*. Да нас у школу прыехала *дэлегацыя*. У складзе *дэлегацыі* былі нашы аднагодкі. У наступным годзе наша *дэлегацыя* паедзе ў іншы горад з візітам. У нашай *дэлегацыі* будуць толькі выдатнікі.

**2** *Мы* (*Н. с.*) вучымся ў школе. У *нас* (*Р. с.*) добрыя адзнакі па ўсіх прадметах. *Нам* (*Д. с.*) даводзіцца многа працаваць. *Намі* (*Т. с.*) задаволены ўсе настаўнікі. Пра *нас* (*В. с.*) пісалі ў дзіцячым часопісе. Настаўнікі ходзяць з *намі* (*Т. с.*) ў кіно.

**3** У *нас* была экскурсія ў лес. Мы спыніліся на палянцы. На *ёй* было шмат розных раслін. Побач з *намі* рос вялікі куст. На *ім* красаваліся прыгожыя кветкі. *Яны* вельмі прыемна пахлі. *Мне* захацелася сарваць кветку. А *яна* ўкалола *мяне* сваімі шыпамі. У *мяне* выступілі слёзы ад болю.

*Тып тэксту: апавяданне.*

**4** Сядзеў каля *мяне* (*1-я ас.*, *адз. л.*, *Р. с.*);
хадзіла з *ёю* (*3-я ас.*, *адз. л.*, *Т. с.*);
прыбег да *яго* (*3-я ас.*, *адз. л.*, *Р. с.*);
расказаў пра *вас* (*2-я ас.*, *мн. л.*, *В. с.*);



*Спампавана з сайта www.aversev.by*

адпачывалі ў *нас* (*1-я ас.*, *мн. л.*, *Р. с.*);
вяртаўся з *табою* (*2-я ас.*, *адз. л.*, *Т. с.*);
спытаў у *цябе* (*2-я ас.*, *адз. л.*, *Р. с.*).

**5** Гэта словы, якія ўказваюць на *асобу* ці *прадмет*, але не *называюць* іх.

Займеннікі, якія ўказваюць на асобы, называюцца *асабовымі*.

Займеннікі ў сказе бываюць *галоўнымі* ці *даданымі* членамі.

Займеннікі могуць ужывацца для сувязі *сказаў* у тэксце.

Яны дапамагаюць пазбегнуць *паўтарэння* адных і тых жа слоў.

Асабовыя займеннікі падзяляюцца на тры *асобы*.

1-я асоба — *я*, *мы*.

2-я асоба — *ты*, *вы*.

3-я асоба — *ён*, *яна*, *яно*, *яны*.

Займеннікі змяняюцца па *ліках*.

Асабовыя займеннікі бываюць *адзіночнага* і *множнага* ліку.

*Я*, *ты*, *ён*, *яна*, *яно* — займеннікі адзіночнага ліку.

*Мы*, *вы*, *яны* — займеннікі множнага ліку.

Займеннікі 3-й асобы ў адзіночным ліку маюць формы ўсіх трох родаў:

ён — *м. р.*;
яна — *ж. р.*;
яно — *н. р.*

Асабовыя займеннікі змяняюцца па *склонах*.



*Спампавана з сайта www.aversev.by*

Склоны і склонавыя пытанні:
*Н. с. — хто?*
*Р. с. — каго?*
*Д. с. — каму?*
*В. с. — каго?*
*Т. с. — кім?*
*М. с. — (пры) кім?*



*Спампавана з сайта www.aversev.by*

# *Ажывi малюнак*






Спампавана з сайта www.aversev.by

# Дзеяслоў

## Змяненне дзеясловаў па часах і ліках

**1** ручай *цячэ*
ластаўкі *лятаюць*
агуркі *растуць*
горад *красуецца*
вучаніца *займаецца*

**2** Не палажыўшы, не знойдзеш. Адклад не ідзе на лад. Калі здолееш узяцца за справу — і снег загарыцца, а не здолееш — і масла не ўспыхне. Адна галавешка і ў печы не гарыць, а дзве і ў полі не гаснуць.

**3** Салдат (*што зрабіў*?) падкруціў вусы. (*Што зрабілі*?) Памылі салдатавы памочнікі шынель і (*што зрабілі*?) пацягнулі на бераг (*што рабіць*?) сушыць. (*Што зрабіла*?) Убачыла гэта царская дачка з палаца — (*што зрабіла*?) здзівілася.

(*Што зрабіў*?) Стаў салдат мужам царскай дачкі, а (*што рабіць*?) жыць у палацы (*што робіць*?) не хоча. (*Што зрабіў*?) Сабраў ён сваё войска і (*што зрабіў*?) пайшоў на цара вайною. (*Што зрабіла*?) Заплакала жонка і сама (*што зрабіла*?) паехала з бацькам на вайну.

**4** Кветка (*што зрабіла*?) адцвіла (*пр. ч., адз. л.*);
сябры (*што зрабілі*?) сустрэліся (*пр. ч., мн. л.*);
дзіця (*што зробіць*?) намалюе (*буд. ч., адз. л.*);
вучні (*што робяць*?) займаюцца (*цяп. ч., мн. л.*);



Спампавана з сайта www.aversev.by

параход (*што зрабіў?*) адплыў (*пр. ч., адз. л.*);
майстар (*што робіць?*) працуе (*цяп. ч., адз. л.*).

**5** Вецер гуляе, *вые*, *дзьме*, *здувае* (*цяп. ч.*).
Зоркі ззялі, *свяцілі*, *мільгалі* (*пр. ч.*).
Агонь гарыць, *асвятляе*, *грэе* (*цяп. ч.*).
Машына паедзе, *паімчыць*, *павязе* (*буд. ч.*).

## Змяненне дзеясловаў прошлага часу па родах. Суфіксы дзеясловаў прошлага часу

**1** Вучаніца *пісала*, *чытала*.
Вучань *пісаў*, *чытаў*.
Дзіця *пісала*, *чытала*.

Сястра *гуляла*, *скакала*.
Брат *гуляў*, *скакаў*.
Кацяня *гуляла*, *скакала*.

Машына *ехала*, *круцілася*.
Аўтобус *ехаў*, *круціўся*.
Кола *ехала*, *круцілася*.

**2**

| | **ён** | **яна** | **яно** |
|---|---|---|---|
| расцвітаць | *расцвітаў* | *расцвітала* | *расцвітала* |
| ісці | *ішоў* | *ішла* | *ішло* |
| зайсці | *зайшоў* | *зайшла* | *зайшло* |
| знайсці | *знайшоў* | *знайшла* | *знайшло* |
| прасіць | *прасіў* | *прасіла* | *прасіла* |
| надзець | *надзеў* | *надзела* | *надзела* |



Спампавана з сайта www.aversev.by

**3** зелянела — *зелянелі*
выглядаў — *выглядалі*
маляваў — *малявалі*
расло — *раслі*
узняло — *узнялі*
шукала — *шукалі*
слухаў — *слухалі*
плыў — *плылі*
збірала — *збіралі*
працаваў — *працавалі*
цвіла — *цвілі*
касіў — *касілі*
пісала — *пісалі*
выглянуў — *выглянулі*

**4** ● Жар-птушка зляцела (*пр. ч., ж. р.*) на зямлю. Тут яна ўбачыла (*пр. ч., ж. р.*) пачастункі.

● Узяў (*пр. ч., м. р.*) Іван гэты клубок і пусціў (*пр. ч., м. р.*) перад сабою.

● Пакланіўся (*пр. ч., м. р.*) Іван старой бабульцы.

● Крумкач выдру дзюбаю біў (*пр. ч., м. р.*). А выдра крумкача зубамі грызла (*пр. ч., ж. р.*).

**5** Малюе — *малявалі*.
Цвіце — *цвілі*.
Зеляне — *зелянелі*.
Прынёс — *прынеслі*.

## Неазначальная форма дзеяслова

**1** Што рабіць? *Маляваць*, *жыць*, *любіць*, *гуляць*, *цвісці*
Што зрабіць? *Выступіць*, *намаляваць*, *пражыць*, *палюбіць*, *прагуляць*, *адцвісці*.



Спампавана з сайта www.aversev.by

| **2** што рабіць? | пр. час | цяп. час | буд. час |
| --- | --- | --- | --- |
| мыць | *мыў(-ла)* | *мыю* | *буду мыць* |
| шукаць | *шукаў(-ла)* | *шукаю* | *буду шукаць* |
| чытаць | *чытаў(-ла)* | *чытаю* | *буду чытаць* |
| вучыць | *вучыў(-ла)* | *вучу* | *буду вучыць* |

**3** Заставіць, падставіць, выставіць, адставіць, прыставіць.

Засадзіць, падсадзіць, высадзіць, адсадзіць, прысадзіць.

Занесці, паднесці, вынесці, аднесці, прынесці.

Забегчы, падбегчы, выбегчы, адбегчы, прыбегчы.

Заехаць, пад’ехаць, выехаць, ад’ехаць, прыехаць.

**4** Ахоўваць (каго?) *сябра* (*В. с.*), (што?) *краіну* (*В. с.*); пісаць (каму?) *бабулі* (*Д. с.*), (аб кім?) *аб жывёлах* (*М. с.*); агледзець (каго?) *дзяўчынку* (*В. с.*), (што?) *дом* (*В. с.*); напісаць (каму?) *матулі* (*Д. с.*), (што?) *навіны* (*В. с.*); вучыць (каго?) *дзяцей* (*В. с.*), (што?) *верш* (*В. с.*).

**5** Чытаць — *прачытаць*; лічыць — *палічыць*; рашыць — *вырашыць*; маляваць — *намаляваць*; грымець — *праграмець*; ззяць — *заззяць*; звінець — *празвінець*; жадаць — *пажадаць*.

## Правапіс дзеясловаў на *-ся*, *-цца*

**1** Хто (*што робіць*?) не ляніцца, той справай сваёй (*што робіць*?) ганарыцца. Трэба (*што зрабіць*?) нахіліцца,



*Спампавана з сайта www.aversev.by*

каб з ручая (*што зрабіць*?) напіцца. У чужым краі толькі вецер (*што зробіць*?) зжаліцца. З якім (*што зробіш*?) пазнаешся, такім сам (*што зробіш*?) станешся.

**2** Лячуся — *цяп. ч., адз. л.*, вылечымся — *буд. ч., мн. л.*, лячылася — *пр. ч., адз. л.*, лечыцца — *цяп. ч., адз. л.*, вылечацца — *буд. ч., мн. л.*, зменішся — *буд. ч., адз. л.*, зменімся — *буд. ч., мн. л.*, памяняліся — *пр. ч., мн. л.*, мяняецца — *цяп. ч., адз. л.*, мяняешся — *цяп. ч., адз. л.*, змяніліся — *пр. ч., мн. л.*, памяняецца — *буд. ч., адз. л.*

**4** Я пад'ехаў да рэчкі. Мне вельмі захацелася выкупацца. Вада ад сонца змянілася, зазіхацела. Рэчка пераліваласся рознымі колерамі. Я зайшоў у ваду і купаўся доўга і з задавальненнем. Накупаўся, выйшаў на бераг і паехаў далей.

**5** Лячыць — *лячуся, лечацца*;
мыць — *памыецеся, памыецца*;
мяняць — *мяняемся, мяняецца*.

## Змяненне дзеясловаў цяперашняга і будучага часу па асобах і ліках (спражэнне)

**2** Птушка ляціць (*3-я ас., адз. л.*); сябар ідзе (*3-я ас., адз. л.*); мы чытаем (*1-я ас., мн. л.*); я мыюся (*1-я ас., адз. л.*); настаўніца сустракае (*3-я ас., адз. л.*); сонейка ўстае (*3-я ас., адз. л.*).



Спампавана з сайта www.aversev.by

**3**

| | | |
|---|---|---|
| *Неазначальная форма* | | *хваліць* |
| 1-я асоба: | адз. л. (я) | *пахвалю* |
| | мн. л. (мы) | *пахвалім* |
| 2-я асоба: | адз. л. (ты) | *пахваліш* |
| | мн. л. (вы) | *пахваліце* |
| 3-я асоба: | адз. л. (ён, яна, яно) | *пахваліць* |
| | мн. л. (яны) | *пахваляць* |

| | | |
|---|---|---|
| *Неазначальная форма* | | *прасіць* |
| 1-я асоба: | адз. л. (я) | *запрашу* |
| | мн. л. (мы) | *запросім* |
| 2-я асоба: | адз. л. (ты) | *запросіш* |
| | мн. л. (вы) | *запросіце* |
| 3-я асоба: | адз. л. (ён, яна, яно) | *запросіць* |
| | мн. л. (яны) | *запросяць* |

**4**

| | | |
|---|---|---|
| *Неазначальная форма* | | *працаваць* |
| 1-я асоба: | адз. л. (я) | *працую* |
| | мн. л. (мы) | *працуем* |
| 2-я асоба: | адз. л. (ты) | *працуеш* |
| | мн. л. (вы) | *працуеце* |
| 3-я асоба: | адз. л. (ён, яна, яно) | *працуе* |
| | мн. л. (яны) | *працуюць* |

| | | |
|---|---|---|
| *Неазначальная форма* | | *вучыцца* |
| 1-я асоба: | адз. л. (я) | *вучуся* |
| | мн. л. (мы) | *вучымся* |
| 2-я асоба: | адз. л. (ты) | *вучышся* |
| | мн. л. (вы) | *вучыцеся* |
| 3-я асоба: | адз. л. (ён, яна, яно) | *вучыцца* |
| | мн. л. (яны) | *вучацца* |



*Спампавана з сайта www.aversev.by*

**5** Дрэва расце (*3-я ас.*, *адз. л.*); тата бяжыць (*3-я ас.*, *адз. л.*); дзеці гуляюць (*3-я ас.*, *мн. л.*); ты малюеш (*2-я ас.*, *адз. л.*); я працую (*1-я ас.*, *адз. л.*).

## Правер сябе

**1** Не хадзіў — *хадзіць*, не плавае — *плаваць*, не крыўдзіла — *крыўдзіць*, не вучылася — *вучыцца*, не губляў — *губляць*, не працавала — *працаваць*, не малюе — *маляваць*, не дзьме — *дзьмуць*.

**2** Я берагу свае кнігі. — *Берагчы кнігі.*

Турысты падымаліся на гару. — *Падымацца на гару.*

Мы добра вучымся ў школе. — *Вучыцца ў школе.*

**3** Моцна дуб стаіць (*адз. л.*, *цяп. ч.*). *Ён* (*3-я ас.*) ніколі не гнецца (*адз. л.*, *цяп. ч.*) ад ветру.

Зелянее (*адз. л.*, *цяп. ч.*) бярозка. *Яна* (*3-я ас.*) шуміць (*адз. л.*, *цяп. ч.*) сваім лісцем.

Сонца ўзыходзіць (*адз. л.*, *цяп. ч.*). *Яно* (*3-я ас.*) шле (*адз. л.*, *цяп. ч.*) наўкола святло.

Міша вучыцца (*адз. л.*, *цяп. ч.*) у чацвёртым класе. *Ён* (*3-я ас.*) добра вучыцца (*адз. л.*, *цяп. ч.*).

**4** Дзеясловы адзіночнага ліку: *іду*, *ідзеш*, *спіць*.

Дзеясловы множнага ліку: *ідзяце*, *ідуць*, *размаўляюць*, *нясуць*.

Дзеясловы 1-й асобы: *іду*.

Дзеясловы 2-й асобы: *ідзеш*, *ідзяце*.

Дзеясловы 3-й асобы: *ідуць*, *размаўляюць*, *нясуць*, *спіць*.



Спампавана з сайта www.aversev.by

## Першае і другое спражэнне дзеясловаў. Канчаткі дзеясловаў 1-й асобы адзіночнага ліку

**1** *Пойдзем* (*буд. ч.*, *мн. л.*, *1-я ас.*, *I спр.*) заўтра вечарам у лес, *паслухаем* (*буд. ч.*, *мн. л.*, *1-я ас.*, *I спр.*) птушак, *адпачнём* (*буд. ч.*, *мн. л.*, *1-я ас.*, *I спр.*). Вожык *шукае* (*цяп. ч.*, *адз. л.*, *3-я ас.*, *I спр.*) сабе ежу, *робіць* (*цяп. ч.*, *адз. л.*, *3-я ас.*, *II спр.*) запасы на зіму. Зязюля *не будуе* (*цяп. ч.*, *адз. л.*, *3-я ас.*, *I спр.*) сабе гнязда, *не вырошчвае* (*цяп. ч.*, *адз. л.*, *3-я ас.*, *I спр.*) сваіх дзетак, таму што не можа іх *выкарміць* (*неазн. ф.*, *II спр.*). Пчолы многа і дружна *працуюць* (*цяп. ч.*, *мн. л.*, *3-я ас.*, *I спр.*), *збіраюць* (*цяп. ч.*, *мн. л.*, *3-я ас.*, *I спр.*) салодкі нектар, *вырабляюць* (*цяп. ч.*, *мн. л.*, *3-я ас.*, *I спр.*) з яго мядок. Лес *прачынаецца* (*цяп. ч.*, *адз. л.*, *3-я ас.*, *I спр.*), як толькі *засвеціцца* (*буд. ч.*, *адз. л.*, *3-я ас.*, *II спр.*) усход белай паласой.

**2** Разважаць (*I* спр.) — *разважаю*;
сябраваць (*I* спр.) — *сябрую*;
збіраць (*I* спр.) — *збіраю*;
гаварыць (*II* спр.) — *гавару*.

**3** Апускаю — *падымаю*, высахну — *вымакну*, успомню — *забуду*, сяджу — *стаю*, хвалю — *га́ню* (*крытыкую*), сустрэну — *прапушчу*, бягу — *стаю*.

**4**

| | мы | вы | яны |
|---|---|---|---|
| нюхаць (*I* спр.) | *нюхаем* | *нюхаеце* | *нюхаюць* |
| танцаваць (*I* спр.) | *танцуем* | *танцуеце* | *танцуюць* |



*Спампавана з сайта www.aversev.by*

| | | | |
|---|---|---|---|
| снедаць (*I* спр.) | *снедаем* | *снедаеце* | *снедаюць* |
| прасіць (*II* спр.) | *просім* | *просіце* | *просяць* |
| хаваць (*I* спр.) | *хаваем* | *хаваеце* | *хаваюць* |

**5** Гудзець (*II* спр.), называю (*I* спр.), помніць (*II* спр.), палоць (*I* спр.), коле (*I* спр.), ляцяць (*II* спр.), ставіць (*II* спр.), чысцяць (*II* спр.), адказваеш (*I* спр.).

## Канчаткі дзеясловаў 3-й асобы множнага ліку I і II спражэння

**2** Вучыць — *вучаць* (*II* спр.);
працаваць — *працуюць* (*I* спр.);
глытаць — *глытаюць* (*I* спр.);
ляжаць — *ляжаць* (*II* спр.);
спяваць — *спяваюць* (*I* спр.);
вазіць — *возяць* (*II* спр.);
званіць — *звоняць* (*II* спр.).

**3** Па садзе *гуляюць* (*I спр.*), дрэвы *садзяць* (*II спр.*), пісьмо *пішуць* (*I спр.*), песню *спяваюць* (*I спр.*), посуд *мыюць* (*I спр.*), сукенку *прасуюць* (*I спр.*), практыкаванне *спісваюць* (*I спр.*), часопіс *чытаюць* (*I спр.*).

**4** *Салаўі спяваюць* (*I спр.*). *Жаўрукі звіняць* (*II спр.*). *Івалгі свішчуць* (*I спр.*). *Сарокі трашчаць* (*II спр.*). *Дзятлы стукаюць* (*I спр.*). *Совы крычаць* (*II спр.*). *Пеўні кукарэкаюць* (*I спр.*).



*Спампавана з сайта www.aversev.by*

## Канчаткі дзеясловаў 1-й асобы множнага ліку I і II спражэння

**2** Чытаю — *чытаем* (*I* спр.);
іду — *ідзём* (*I* спр.);
паважаю — *паважаем* (*I* спр.);
думаю — *думаем* (*I* спр.);
вучу — *вучым* (*II* спр.);
ляжу — *ляжым* (*II* спр.);
стаўлю — *ставім* (*II* спр.);
гляджу — *глядзім* (*II* спр.);
цвіту — *цвіцём* (*I* спр.).

**3** Шукаем (*1-я ас.*, *I спр.*), збіраем (*1-я ас.*, *I спр.*), бачым (*1-я ас.*, *II спр.*), дагонім (*1-я ас.*, *II спр.*), разглядаем (*1-я ас.*, *I спр.*), глядзім (*1-я ас.*, *II спр.*), палезем (*1-я ас.*, *I спр.*), губляем (*1-я ас.*, *I спр.*), убачым (*1-я ас.*, *II спр.*), складзём (*1-я ас.*, *I спр.*), заўважаем (*1-я ас.*, *I спр.*), выйдзем (*1-я ас.*, *I спр.*).

## Канчаткі дзеясловаў 2-й асобы адзіночнага ліку I і II спражэння

**2** Лавіць (*II* спр.) — *ловіш*;
гатаваць (*I* спр.) — *гатуеш*;
патануць (*I* спр.) — *патонеш*;
накрыць (*I* спр.) — *накрыеш*;
атуліць (*II* спр.) — *атуліш*;
прыспешваць (*I* спр.) — *прыспешваеш*;



*Спампавана з сайта www.aversev.by*

плакаць (*I* спр.) — *плачаш*;
варыць (*II* спр.) — *варыш*;
свяціць (*II* спр.) — *свеціш*.

**3** малюю — *малюеш*
бачу — *бачыш*
страляю — *страляеш*
працую — *працуеш*
плыву — *плывеш*

бегаю — *бегаеш*
адыходжу — *адыходзіш*
чую — *чуеш*
запісваю — *запісваеш*
выбіваю — *выбіваеш*

**4** *Цяп. ч.*: Кошка сядзіць (*3-я ас.*) на акне і старанна мыецца (*3-я ас.*) лапкай. Слёзы коцяцца (*3-я ас.*) па шчочках дзяўчынкі, а мама яе супакойвае (*3-я ас.*). Бабры валяць (*3-я ас.*) дрэвы, робяць (*3-я ас.*) на рацэ запруды. Красуе (*3-я ас.*) і хвалюецца (*3-я ас.*) на лёгкім ветрыку спелае жыта.

*Буд. ч.*: Зоркі задрыжаць (*3-я ас.*), засвецяцца (*3-я ас.*), пачнуць (*3-я ас.*) пераліваццa рознымі колерамі. Сонца ўзнімецца (*3-я ас.*) вышэй і сагрэе (*3-я ас.*) зямлю. Раніцай дзьмухаўцы прачнуцца (*3-я ас.*), заўсміхаюцца (*3-я ас.*) адзін аднаму. Загарыцца (*3-я ас.*) неба адценнямі чырвонага і залатога.



Спампавана з сайта www.aversev.by

## Канчаткі дзеясловаў 2-й асобы множнага ліку I і II спражэння

**2** гаворыш — *гаворыце* ставіш — *ставіце*
бярэш — *берацé* працуеш — *працуеце*
будуеш — *будуеце* бачыш — *бачыце*
скачаш — *скачаце* ходзіш — *ходзіце*
блішчыш — *блішчыце* пішаш — *пішаце*

**3**

| | **мы** | **вы** |
|---|---|---|
| саліць (*II* спр.) | *солім* | *соліце* |
| ехаць (*I* спр.) | *едзем* | *едзеце* |
| глядзець (*II* спр.) | *глядзім* | *гледзіцé* |
| запрашаць (*I* спр.) | *запрашаем* | *запрашаеце* |
| спаць (*II* спр.) | *спім* | *спіцé* |
| адказваць (*I* спр.) | *адказваем* | *адказваеце* |

**4**

| | 1-я ас., адз. л. (*я*) | 1-я ас., мн. л. (*мы*) |
|---|---|---|
| працаваць | *працавала* / *працаваў* | *працавалі* |
| вучыць | *вычыла* / *вучыў* | *вучылі* |
| чытаць | *чытала* / *чытаў* | *чыталі* |
| падаць | *падала* / *падаў* | *падалі* |
| цвісці | *цвіла* / *цвіў* | *цвілі* |

| | 2-я ас., адз. л. (*ты*) | 2-я ас., мн. л. (*вы*) |
|---|---|---|
| | *працавала* / *працаваў* | *працавалі* |
| | *вучыла* / *вучыў* | *вучылі* |



*Спампавана з сайта www.aversev.by*

| | |
|---|---|
| *чытала* / *чытаў* | *чыталі* |
| *падала* / *падаў* | *падалі* |
| *цвіла* / *цвіў* | *цвілі* |

## Канчаткі дзеясловаў 3-й асобы адзіночнага ліку I і II спражэння

**2**

| | адз. л., ж. р. | адз. л., м. р. |
|---|---|---|
| ісці | *ішла* | *ішоў* |
| пісаць | *пісала* | *пісаў* |
| ляцець | *ляцела* | *ляцеў* |
| глядзець | *глядзела* | *глядзеў* |
| спаць | *спáла* | *спаў* |

| адз. л., н. р. | мн. л. |
|---|---|
| *ішло* | *ішлі* |
| *пісала* | *пісалі* |
| *ляцела* | *ляцелі* |
| *глядзела* | *глядзелі* |
| *спала* | *спалі* |

**3** Вясна ідзе (*I спр.*).
Песня льецца (*I спр.*).
Лес маўчыць (*II спр.*).
Сонейка смяецца (*I спр.*).
Палі шумяць (*II спр.*).
Рэкі спяць (*II спр.*).
Шчокі гараць (*II спр.*).



*Спампавана з сайта www.aversev.by*

**4** *Павява*[*е*] (*I спр.*) цёплы ветрык. *Раста*[*е*] (*I спр.*) апошні снег у лесе. Звяры *прадчува*[*юць*] (*I спр.*) набліжэнне вясны. *Вярта*[*юц*]*ца* (*I спр.*) пералётныя птушкі.

## Правер сябе

**1** *Унізе*, *аб'язджаць*, *апетыт*.

**2** Надыходзіў (*адз. л.*, *м. р.*) вечар. Сонейка апускалася (*адз. л.*, *н. р.*) ніжэй і даставала (*адз. л.*, *н. р.*) да самых верхавін высокіх сосен. Жучкі і конікі на лузе хаваліся (*мн. л.*) пад травінкі. Воблачкі станавіліся (*мн. л.*) ружовага колеру. Усё рыхтавалася (*адз. л.*, *н. р.*) да сну.

**3** I спр.: *злучаць*, *напісаць*, *збудаваць*, *шаптаць*, *рыхтаваць*, *бегчы*.

II спр.: *касіць*, *спыніць*, *вазіць*, *адчыніць*, *расхваліць*, *крычаць*, *мучыць*, *бачыць*, *лячыць*.

**5** Дзеясловы абазначаюць *дзеянне прадмета* і адказваюць на пытанні *што рабіць*? *што зрабіць*?

У сказах дзеясловы з'яўляюцца *выказнікамі*.

Дзеясловы змяняюцца па *часах*, *ліках* і *родах*.

Дзеясловы бываюць *прошлага*, *цяперашняга* і *будучага* часу.

Дзеясловы прошлага часу адказваюць на пытанні *што рабіў*? *што зрабіў*?

Дзеясловы цяперашняга часу адказваюць на пытанні *што робіць*? *што робяць*?

Дзеясловы будучага часу адказваюць на пытанні *што будзе рабіць*? *што зробіць*?



*Спампавана з сайта www.aversev.by*

Дзеясловы ў неазначальнай форме адказваюць на пытанні *што рабіць*? *што зрабіць*? Яны заканчваюцца на *-ць*, *-ці*, *-чы*.

У дзеясловаў у неазначальнай форме нельга вызначыць *час*, *лік*, *род*.

«Не» з дзеясловамі пішацца *асобна*.

Дзеясловы бываюць *адзіночнага* і *множнага* ліку.

Змяненне дзеясловаў цяперашняга і будучага часу па асобах і ліках называецца *спражэннем*. Асобу і лік дзеяслова можна вызначыць па *канчатку* і па *займенніку*, з якім спалучаецца дзеяслоў.

Каб вызначыць, да якога спражэння адносіцца дзеяслоў, трэба паставіць яго ў форму *3-й асобы множнага ліку*.

Дзеясловы I спражэння маюць канчаткі *-уць*, *-юць*. Дзеясловы II спражэння маюць канчаткі *-аць*, *-яць*.

Дзеясловы прошлага часу змяняюцца па *ліках*, а ў адзіночным ліку — па *родах*.



*Спампавана з сайта www.aversev.by*

## *Ажыві малюнкі*






Спампавана з сайта www.aversev.by

# Паўтарэнне вывучанага ў 4 класе

**1** Ясік піша павольна, але прыгожа.
Алеся піша хутка, але неахайна.
Я прыйшоў не да цябе, а да твайго брата.

**2** Сонца грэ*е* ўсё мацней і мацней. На дрэвах распускаюцца пупышкі. З цёпл*ых* краёў прылята*юць* да нас гракі, шпакі, дразды і іншыя пералётн*ыя* птушкі. Яны знішча*юць* шкодн*ых* насякомых, ч*ы*сцячы ад іх дрэвы, гр*а*дкі з гароднінай. Мы клапо*ц*імся аб птушк*ах*, ахоўва*ем* іх. Зараз у птушак гарачая пара. Яны буду*юць* гнёзды. Пазней вывед*уць* маленьк*іх* птушанят і буд*уць* карм*іць* іх насякомымі. Будуць чыст*ыя* нашы сады і агароды!

**3** ~~ТШЕДШЕТАЕШТ ШТЕПТШАЕШТБШТЕАЕШЧТЕЭШЕТНЕТШНШТЕЯ~~! *Да пабачэння!*

## Творчыя заданні

**2** Летам ярка цвіце травяністы луг. Лугавыя кветкі пакрываюць траву. З іх атрымліваецца сапраўдны дыван. Ціха шэпчуцца паміж сабою травінкі і кветкі. Яны шэпчуць, што хутка прыйдзе восень.

**3** Любит и уважает Серёжа своего старенького дедушку. Особенно он любит слушать рассказы деда. А старику



*Спампавана з сайта www.aversev.by*

есть что рассказать. Где только он не был, каких людей не видел! Купался дед в пяти больших морях. Ловил рыбу в Днепре, Припяти, Немане, даже Волге. За плечами у дедушки много интересных случаев. Сейчас дед живёт в Минске и помогает воспитывать внуков и правнуков.

4 Светлымі днямі і цёмнымі начамі бяжыць з крутой гары празрысты ручай. Праліўныя дажджы добра сілкуюць яго. Бяжыць пераліўчаты ручай і ў марозныя дні. Насоўваецца на яго ледзяная корка. Але смелы ручаёк не здаецца. Ён струменіцца пад халоднай коркай лёду.

5 Однажды я пошёл ловить рыбу. Меня не было дома целый день. Я наловил много рыбы. По дороге домой меня застала (застигла) гроза. Надо мной гремел гром, блестела молния. От дождя на мне промокла одежда.

6

**Вечар**

Сонца пачынала заходзіць. Доўгія цені ўпалі на паляны. Павольна надыходзіў (насоўваўся) змрок. Забялеў туман. Засерабрылася поле. Пачалі лётаць у паветры начныя жукі. З-за лесу паказаўся месяц. На небе сталі загарацца зоркі. Усюды пануе цішыня.



*Спампавана з сайта www.aversev.by*

ВЫДАВЕЦТВА
АВЕРСЭВ







**Беларуская мова. 2 клас. Рабочы сшытак**

**Беларуская мова. 4 клас. Рабочы сшытак**

Сшыткі (аўтары *А. М. Іванова*, *А. М. Карасевіч*, *Ю. У. Раскоша*) адпавядаюць вучэбным праграмам і зместу падручнікаў па беларускай мове і літаратурным чытанні. У дапаможніках прапануюцца цікавыя творчыя заданні розных узроўняў складанасці, што дазволіць школьнікам праверыць і замацаваць атрыманыя на ўроках веды. Рэалізаваны ў выданнях прынцып міжпрадметных сувязей будзе садзейнічаць комплекснаму засваенню вучэбнага матэрыялу.

**У серыю таксама ўваходзіць сшытак для 3 класа.**

**aversev.by**
Поўны каталог вучэбнай літаратуры, карысныя матэрыялы, а таксама акцыі і спецыяльныя прапановы.